ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (2006) ● Чацвер, 13 лістапада 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

СТАЖЫРОЎКА выпускнікоў педагагічных інстытутаў і універсітэтаў уведзена у мінулым навучальным годзе. Стажыроўцы маладых настаўнікаў папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа у школах, раённых і абласных аддзелах народнай асветы. Асноўнымі кірункамі гэтай работы былі: вывучэнне інструктыўных пісьмаў міністэрству асветы СССР і БССР, падбор кіраўнікоў стажыроўкі і правядзенне з імі семінараў, складанне і зацвярджэнне індывідуальных планаў, арганізацыя метадычнымі кабінетамі раённых аддзелаў народнай асветы вучобы маладых спецыялістаў, сустрэчы з ветэранамі педагагічнай працы, дні адкрытых дзвярэй і інш.

У 1974 годзе на працу ў школы былі накіраваны 483 выпускнікі. Большасць з іх у 1974—1975 навучальным годзе прайшлі стажыроўку. Камісіямі было адзначана, што маладыя настаўнікі за час стажыроўкі паказалі сябе палітычна адукаванымі, тэарэтычна і метадычна падрыхтаванымі спецыялістамі.

У 1975 годзе ў школы рэспублікі накіраваны 552 маладыя спецыялісты, якія прыступілі да стажыроўкі. Дэканатамі і кафедрамі універсітэта падтрымліваюцца пастаянныя сувязі з раённымі і абласнымі аддзеламі народнай асветы рэспублікі. Для аказання метадычнай дапамогі школам і раённым аддзелам у правядзенні і удасканальванні стажыроўкі прыцягваюцца найбольш кваліфікаваныя выкладчыкі, якія перыядычна выязджаюць у раёны. Кафедры пачалі больш цесна спалучаць выкладанне спецыяльных дысцыплін і прыватных методык са школьнай праграмай.

Стажыроўка выпускнікоў юрыдычнага факультэта праводзілася цэнтралізавана. Кантроль за ходам стажыроўкі дэканат і кафедры планаванні і арганізацыі стажыроўкі маладых спецыялістаў.

Па размеркаванню ў 1974 годзе на работу ў рэдакцыі раённых газет і на тэле- і радыёстудыі абласцей рэспублікі былі накіраваны 82 выпускнікі журфака; у 1975 годзе — 67 чалавек. Аднак толькі у гэтым годзе рэдакцыі газет і студый прыступяць да стажыроўкі маладых спецыялістаў. Да гэтага часу рэдакцыі газет і студый не атрымалі указанняў аб правядзенні стажыроўкі. З дапамогай кафедр журфака стажыроўка будзе арганізавана у 1975—1976 навучальным годзе.

Кантроль і дапамогу у арганізацыі і правядзенні стажыроўкі выпускнікоў прыродазнаўчых факультэтаў здзяйсняюць кафедры адпаведных факультэтаў.

Прэзідыум АН БССР устанавіў парадак правядзення стажыроўкі, у адпаведнасці з якім спецыялісты, залічаныя на пасады стажораў-даследчыкаў і у аспірантуру, вызваляюцца ад стажыроўкі, усе астатнія абавязаны праходзіць гадавую стажыроўку. На гэтай аснове інстытутамі Акадэміі навук складзены тыпавыя праграмы стажыроўкі, арганізаваны камісіі па атэстацыі стажораў. Напрыклад, у інстытуце ядзернай энергетыкі у маі 1974 года абмяркоўваўся ход стажыроўкі. Усе стажоры-выпускнікі атэставаны станоўча.

Кафедры прыродазнаўчых факультэтаў падтрымліваюць цесныя сувязі з інстытутамі АН БССР. На фізічным, механіка-матэматычным факультэтах кожная кафедра замацавана за адным з інстытутаў Акадэміі навук.

На прадпрыемствах, у навукова-даследчых інстытутах міністэрству радыё і электроннай прамысловасці у красавіку—маі мінулага года былі выданы загады, у якіх вызначаюся парадак праходжання стажыроўкі на гэтых прадпрыемствах, распрацаваны тыпавыя праграмы і прыкладныя індывідуальныя планы стажыроўкі. Арганізаваны камісіі для кардынацыі работы у падраздзяленнях. Кіраўнікамі стажыроўкі назначаліся найбольш кваліфікаваныя інжынерна-тэхнічныя работнікі. У выніку усе маладыя спецыялісты набылі неабходныя практычныя і арганізатарскія навыкі для самастойнай работы.

Неабходна адзначыць, што рэктарат, саветы універсітэта і факультэтаў, дэканаты і кафедры прарабілі значную работу па аказанню дапамогі прадпрыемствам, установам ва удасканаленні стажыроўкі маладых спецыялістаў. Але ёсць у гэтай рабоце і недахопы, на ліквідаванне якіх і патрэбна скіраваць у далейшым усе намаганні.

СЁННЯ—ВЫПУСКНІК, ЗАЎТРА—СПЕЦЫЯЛІСТ

На чарговым пасяджэнні рэктарата БДУ адбылося абмеркаванне пытання аб ходзе стажыроўкі выпускнікоў універсітэта. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў загадчык вытворчай практыкі У. Д. МУХАЕЎ.

пачалі здзяісняць з верасня мінулага года. На абмеркаванні пытання аб арганізацыі стажыроўкі, якое адбылося на пасяджэнні савета факультэта, прысутнічалі намеснік пракурора БССР на кадрах А. І. Тарасевіч і прадстаўнік Міністэрства юстыцыі БССР А. Р. Кашанскі. Яны паведамілі аб падрыхтоўцы і правядзенні стажыроўкі у органах суда і пракуратуры.

Факультэтамі і кафедрамі наладжаны цесныя сувязі з абласнымі і раённымі органамі пракуратуры, суда, выканкомаў. У мінулым годзе юрфак пачаў падрыхтоўку спецыялістаў для юрыдычных аддзелаў упраўленняў сельскай гаспадаркі, спажывакааперацыі і «Белсельгастэхнікі», таму перад кафедрамі стаіць задача дапамагчы гэтым арганізацыям у

ПА БДУ

4 лістапада у БДУ у парадку абмену прыбыла група моладзі з ГДР. За дзесяць дзён студэнты Іенскага універсітэта наведалі цікавейшыя мясціны беларускай сталіцы, помнік вайны — Хатынь. За гэты час удзельнікі нямецкага ансамбля імя М. Раймона далі шмат канцэртаў для беларускіх гледачоў.

***

У сераду, 12 лістапада, адбыуся спартыуны вечар, на якім прысутнічалі госці з ГДР. У завяршэнне вечара студэнты Іенскага універсітэта далі канцэрт.

***

Юнакі і дзяўчаты з В'етнама, ГДР, Кубы, Польшчы, Ірана, Чэхаславакіі, Гвінеі і іншых краін, якія у гэтым навучальным годзе атрымалі студэнцкія білеты БДУ, нядаўна пабывалі у Хатыні. Яны ускладлі кветкі ля Вечнага агню.

На Кургане Славы адбылося урачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты.

ЮБІАЕЙ ПЕРШАГА ВЫПУСКУ

Пяцьдзесят год прайшло з таго часу, як наш універсітэт выпусціў сваіх першых выхаванцаў, дыпламаваных спецыялістаў. Такі блізкі і такі далёкі 1925 год... Нямногіх з памятнага выпуску удалося адшукаць. Гэта і зразумела: паміж сённяшнімі і тымі, пяцідзесяцігадовай даунасці, днямі пралягло не адно цяжкое выпрабаванне, і галоўным была Вялікая Айчынная вайна. Ну, а тыя, хто застаўся у працоўным страі, і сёння высока нясуць сцяг адукацыі, хоць і сталі ужо пенсіянерамі.

У бліжэйшыя дні мяркуецца правесці агульнаўніверсітэцкі вечар, прысвечаны 50-годдзю першага выпуску спецыялістаў. Паслухаць расказы першых студэнтаў нашай установы прыйдуць камсамольцы БДУ, яго выкладчыкі і супрацоўнікі. Асаблівай будзе сустрэча з ветэранамі у першакурснікаў, сустрэча двух пакаленняў.

Ужо створаны арганізацыйны камітэт па правядзенню урачыстасцей; яго старшыня — А. І. Кажушкоу, дэкан падрыхтоўчага факультэта. Да выступлення на святочным вечары рыхтуюцца народныя калектывы самадзейнасці БДУ.

Несумненна, сустрэча з тымі, чыё юнацтва прайшло ва універсітэцкіх сценах у далёкія 20-я гады, прынясе нам шчырую радасць, будзе плённай.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

ЭКСПЕРЫМЕНТ— ЛЬГОТНАЕ ХАРЧАВАННЕ

Год назад два саюзныя міністэрствы — вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і гандлю — выдалі загад «Аб арганізацыі эксперыменту льготнага харчавання па абанементах». Спроба аказалася удачнай. Сёлета з гэтага семестра уводзіцца льготнае харчаванне для студэнтаў першых курсаў Мардоускага універсітэта.

Рацыянальна планаваць дзень, эканамічна расходаваць стыпендыю, клапаціцца аб уласным здароуі — краіне ж патрэбны не толькі высокакваліфікаваныя, але і здаровыя спецыялісты, — вось чаму дапамагае льготнае харчаванне. Здзяйсняецца яно па абанементах са скідкай 50 працэнтаў ад кошту абеду за лік выкарыстання часткі сродкаў спецыяльнага фонду. Паступова льготнае харчаванне будзе уводзіцца і для студэнтаў старэйшых курсаў.

(«Мардоускі універсітэт»)

ПЕРСПЕКТЫВЫ РОСТУ

У ВНУ КРАІНЫ

У Чалябінскім політэхнічным інстытуце імя Леніскага камсамола за пяцігодку выканана навуковых даследаванняу на суму звыш 28 млн. рублёў, што у 2,4 раза больш, чым было у мінулай пяцігодцы. Укаранёна ў вытворчасць каля 40 навукова - даследчых прац. 65 работ чалябінскіх політэхнікаў дэманстраваліся у дзевятай пяцігодцы на ВДНГ, 3 — на міжнародных выстаўках. Атрымана 738 аутарскіх пасведчанняу і станоучых рашэнняу, што ў 4,6 раза больш, чым за той жа перыяд восьмай пяцігодкі.

(«За інжынерныя кадры», Чалябінск).

СУСТРЭЧЫ СЯБРОЎ

Народны ансамбль танца БДУ «Крыжачок» карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод самадзейных калектываў ВНУ. У маі гэтага года «Крыжачок» пабываў у ГДР, у сваіх сяброу—студэнтаў Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера.

У парадку абмену і умацавання дружалюбных сувязей 4 лістапада у БДУ прыбыла група нямецкай моладзі, у саставе якой знаходзіліся удзельнікі ансамбля імя М. Раймона, члены Саюза нямецкай свабоднай моладзі.

З разнастайнай і цікавай праграмай, у якую уваходзілі рускія, старадаўнія нямецкія песні, класічныя творы, песні народаў свету, выступілі студэнты з ГДР перад беларускімі гледачамі. З вялікім поспехам прайшоу канцэрт на радзіме БЕЛАЗау—у горадзе Жодзіна. Асабліва спадабалася гледачам у выкананні нямецкіх дзяўчат руская песня «Размовы». Пасля канцэрта артысты наведалі славуты аутамабільны завод.

Камітэт камсамола, прафком БДУ арганізавалі для гасцей цікавыя экскурсіі у Хатынь, на ВДНГ БССР, у Дом-музей І з'езда РСДРП. Нямецкія студэнты азнаёміліся з Беларускім універсітэтам, пабывалі ў вылічальным цэнтры, у лабараторыях, даведаліся аб жыцці сваіх сяброу.

7 лістапада разам з нашымі студэнтамі нямецкая моладзь прымала удзел у святочнай дэманстрацыі, прысвечанай 58-й гадавіне Вялікага Кастрычніка.

Канцэрты і вечары сустрэч з гасцямі з ГДР, якія адбыліся ў БДУ, у політэхнічным інстытуце, пакінулі пасля сябе добрыя успаміны і, канешне ж, шмат новых сяброу.

І. САВЕТКІНА.

7 Лістапада у святочных калонах дэманстрантаў прайшлі студэнты буйнейшай у рэспубліцы навучальнай установы —БДУ імя У. І. Леніна. Яны рапартавалі партыі і народу аб сваіх поспехах у вучобе, добрасумленнай працы у трэцім, працоуным семестры.

Фота **М. Нечыпарэнкі і А. Цыгулёва.**

ПАРАДЫ ПЕРШАКУРСНІКУ

Вучэбны працэс у ВНУ значна адрозніваецца ад таго, да якога прывыклі учарашнія школьнікі. Тут, як правіла, няма штодзённых заданняў і штодзённага кантролю за іх выкананнем, няма пастаяннага апякунства. Свой час і работу у значнай меры даводзіцца планаваць самому. А вось гэта якраз многім першакурснікам даецца з цяжкасцю.

Дарэчы, і студэнты старэйшых курсаў не заўсёды дастаткова арганізаваны, за што і разлічваюцца начнымі думамі у час сесій, клопатамі аб ліквідацыі «хвастоў», нервовым перанапружаннем.

Вучэбная праца, як ніякая іншая, несумяшчальна са штурмаўшчынай. Хай вы прымусіце сябе прасядзець за падручнікам хоць цэлыя суткі, прачытаеце яго некалькі разоў — усё роўна стомлены мозг не зможа добра засвоіць матэрыял.

Працаздольнасць нервовых клетак мае межы; не спрабуйце павысіць яе падобным знясільваннем — вынік будзе адваротным! Адзіна правільны шлях — планамерная штодзённая работа, трэніроўка памяці, увагі, сілы волі. Перш за усё прадумайце рэжым свайго дня. Асноўныя арыенціры такія: спаць восем тадзін. Есці тры-чатыры разы у дзень, пажадана. Значыцца, можна спакойна дачытаць цікавы дэтэктыў, пагуляць з суседам у «марскі бой» ці, раскрыушы падручнік, рыхтавацца да маючага адбыцца калёквіума...

І вось прапалі і гэтыя дзве гадзіны, і тыя адна-паутары, што пойдуць потым на перапісванне чужога канспекта. І прыйдзецца патраціць у дадатак час на разбор сённяшняга матэрыялу—ён жа будзе успрымацца як зусім новы і незнаёмы.

Канспект лекцый вядзіце абавязкова! Прычым механічнае фіксіраванне таго, што чуеш, прыносіць не шмат карысці. Старайцеся запісваць «сваімі словамі» хутка, чотка, адразу начыста. Каб паспяваць за лектарам, карыстайцеся умоўнымі абазначэннямі — і агульнапрынятымі і прыдуманымі— прымяняльна да выкладаемай дысцыпліны. Напрыклад, ЦНС—цэнтральная нервовая сістэма, РНК — рыбануклеінавыя кіслоты, АСК — аутаматызаваная сістэма кіравання, > — расце, < — падае і тэму падобнае.

Запіс асноунага сэнсу лекцыі дапамагае засяроджваць увагу. У канспектаванні удзельнічаюць слых, зрок, рука, а гэта значыць, што мабілізуюцца і трэніруюцца розныя віды памяці. Такім чынам, запісваючы лекцыі, вы не толькі засвойваеце даны прадмет, але і павышаеце сваю разумовую працаздольнасць.

Карысна канспектаваць і падручнік: большасць людзей намнога лепш запамінае прачытанае, калі паралельна з чытаннем робяцца выпіскі.

Навучыцеся запісваць матэрыял у выглядзе тэзісаў — закончаных палажэнняў, фармуляванак аутарскай думкі. Такая работа патрабуе сур'ёзнага абдумвання тэксту і таму садзейнічае лепшаму засваенню матэрыялу.

Прыкладна палавіна часу, якім студэнт распараджаецца для засваення праграмы, адводзіцца самастойнай рабоце. Займацца неабходна не менш 4 гадзін у дзень, акрамя нядзелі. Нядзелю абавязкова прысвячайце адпачынку, спорту, турысцкім паходам, тэатру!

Э. САРКІСЯНЦ,
кандыдат медыцынскіх навук.

НЕ РАЗБАЗАРВАЙЦЕ ЧАС

Актыуна працуе адкрыушаяся нядауна выстаука новых паступленняу літаратуры на трэцім паверсе галоунага корпуса універсітэта. Наведвальнікі выстаукі ужо пакінулі у кнізе водгукаў свае запісы: «Прагледзела больш 30 кніг. Асабліва добрыя кнігі па мастацтву», «Штотыднёвая выстаука новых паступленняу дае магчымасць азнаёміцца з новай літаратурай, якая паступіла у нашу бібліятэку. Вельмі зручна і выгадна, што перыядычную літаратуру і іншыя выданні можна заказваць якраз на выстауцы».

Зараз у пакоі багата прадстаулены кнігі з серыі «Жыццё у мастацтве». У апошняй дэкадзе лістапада тут будзе арганізавана тэматычная выстаука «Сучасная жанчына і грамадства», ідзе падбор кніг да святкавання 150-годдзя паустання дзекабрыстау.

Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

М. І. КАЛІНІН — МОЛАДЗІ

19 лістапада спауняецца 100 год з дня нараджэння М. І. КАЛІНІНА (1875—1946), дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы.

Для авалодання марксізмам - ленінізмам зусім недастаткова завучыць формулы і вывады гэтай тэорыі, для гэтага недастаткова засвоіць і яе сутнасць. Каб па-сапраўднаму авалодаць марксізмам-ленінізмам, для гэтага трэба яшчэ навучыцца карыстацца гэтай тэорыяй пры рашэнні практычных пытанняу, а калі ісці далей, то і умець узбагачаць гэту тэорыю накопленым вопытам, абагульняць вопыт, г. зн. умець развіваць яе і рухаць наперад.

У нас ёсць пралетарская мараль, і мы павінны развіваць, узмацняць яе і на гэтай пралетарскай маралі выхоуваць будучае пакаленне. Наша мараль заключаецца ў тым, што ўсё, што садзейнічае умацаванню рабочага класа, яго баявой моцы, развіццю сацыялістычнага будауніцтва, — усё гэта, безумоўна, абавязкова для камсамольца і партыйца, усё гэта ён павінен рабіць, усё гэта з'яуляецца яго маральным абавязкам.

Ад усякага добрага спецыяліста, акрамя ведаў, патрабуецца яшчэ, каб ён быу арганізатарам. Быць проста інжынерам, урачом, настаунікам і г. д. — дасягненне яшчэ невялікае. Неабходна дабівацца таго, каб атрыманыя веды прымянялся з максімальным эфектам.

У ПАДАРУНАК БУДАЎНІКАМ

Камсамольская група бібліятэкі БДУ налічвае 14 камсамольцаў. Як і ўся наша краіна, мы сочым за ударнай камсамольскай будоуляй Байкала-Амурскай магістралі. Яшчэ учора бамаўцы будавалі сабе жыллё — сёння яны будуюць бібліятэкі.

Улічваючы спецыфіку нашай працы, бамаўцы звярнуліся да нас з просьбай дапамагчы ім папоўніць свае кніжныя запасы неабходнай літаратурай. Адгукнуцца на гэту просьбу — наш абавязак.

Зараз праводзіцца адбор мастацкай літаратуры для пасылкі у дар бібліятэкам БАМа. Усяго будзе паслана 1500 кніг. Камсамольцы нашай ячэйкі ўяуляюць важнасць задачы, якая стаіць перад імі. У цяперашні час пры іх актыўным удзеле адабрана больш 200 экземпляраў разнастайных па тэматыцы кніг, у тым лiку і дзіцячых, якія таксама вельмі патрэбны на БАМе. Збор кніг працягваецца.

Г. БАЧКОВА,
групкамсорг бібліятэкі універсітэта.

ТВОИ ЭТЫКЕТ

З ЧАГО СКЛАДАЕЦЦА ВЫХАВАНАСЦЬ?

АД РЭДАКЦЫІ: сёння мы працягваем размову пра эстэтычнае і маральнае выхаванне студэнтау. Запрашаем усіх жадаючых прыняць у ёй удзел.

Каб быць чалавекам выхаваным, трэба ведаць, як ім быць. Бо ні інтуіцыя, ні спагаднасць не дапамогуць нам, калі мы не ведаем пэуных норм паводзін. Дзесьці абавязкова праявіцца наша няёмкасць, няумеласць. Дапусцім, мы паспрабавалі ліквідаваць гэты прабел, чытаючы спецыяльную літаратуру, слухаючы спецыяльныя лекцыі. Што ж, гэта ужо крок наперад, і крок значны. Але вось гора: паспрабаваушы выкарыстаць на практыцы атрыманыя веды, мы пераконваемся, што больш свабодна адчуваць сябе сярод людзей так і не сталі. Наадварот: паявіліся яшчэ дадатковыя клопаты у выглядзе пакутлівых пошукау найлепшага варыянту паводзін. А справа у тым, што веданне этыкету не атрымала пераламлення праз пачуцці, эмоцыі, не стала арганічным, не пераутварылася у неабходныя навыкі, звычкі, манеры, якія і робяць нашы паводзіны свабоднымі і натуральнымі. І каб набыць гэтыя якасці, патрэбна карпатлівая праца. Бо толькі тады кожнае наша дзеянне набудзе неабходную аутаматычнасць.

Але звычка пачынаецца з учынку. Нездарма ж у народзе гавораць: «Пасееш учынак — пажнеш звычку, пасееш звычку — пажнеш характар, пасееш характар — пажнеш лес». Некаторым маладым людзям перашкаджае якраз іх няведанне, а іменна адсутнасць неабходных у даным выпадку станоучых звычак. Спытайце, як трэба праходзіць у тэатры паміж радамі? Амаль усе адкажуць правільна: тварам да тых, хто сядзіць на крэслах. Хто каму павінен з гатоунасцю уступаць месца у грамадскім транспарце? Натуральна, малодшы старэйшаму, мужчына — жанчыне. Але на практыцы часта бывае інакш, г. зн. з парушэннем норм этыкету.

Каштоунасць станоучай звычкі, добрых манер якраз і заключаецца у тым, што яны вызваляюць нас ад неабходнасці выбіраць кожны раз з маруднасцю вучня патрэбны спосаб паводзін, вызваляюць нашу свядомасць ад дробных клопатаў і бясконцага пошуку выхаду з увогуле нескладанага лабірынту. Вялікі педагог К. Д. Ушынскі вызначаў добрую звычку як маральны капітал, які чалавек паклаў у сваю нервовую сістэму. Прычым капітал гэты няспынна расце, і працэнтамі з яго чалавек карыстаецца усё жыццё. І наадварот: дрэнная звычка выглядае як нявыплачаная пазыка. Яна можа давесці чалавека да поўнага маральнага банкруцтва.

Такім чынам, залог выхаванасці кожнага чалавека — у трывалым сплаве ведання этыкету, станоучых адносінах да яго патрабаванняу і звычцы захоуваць яго нормы у паўсядзённых жыццёвых сітуацыях.

З чаго складаецца выхаванасць? У паняцце яе уваходзяць і культура адносін, і культура знешняга выгляду, і глыбокая унутраная культура. Да таго ж, мы абавязкова павінны быць перакананы ў мэтазгоднасці норм этыкету і іх абавязковасці для кожнага члена грамадства. І тады мы зможам заусёды легка вызначаць тую лінію паводзін, якая найбольш правільная для данага выпадку.

Пытанні культуры паводзін набываюць сёння асаблівую актуальнасць. Бо сёння больш напружаным стаў рытм жыцця. Людзі сталі больш непрымірымымі да грубасці, пошласці, хамства.

Наша культура пачынаецца з культуры знешняга выгляду. Гэта своеасаблівая візітная картка чалавека. Юнак і дзяучына, якія паважаюць сябе, ніколі не паявяцца у грамадскім месцы неахайна апранутымі. Яшчэ Рабле пісаў: «Няхай ворагі мае заусёды паяуляюцца на вуліцы у дрэнным выглядзе».

Несумненна, усе мы хочам выглядаць элегантнымі, з густам апранутымі, прыгожа прычасанымі, прыемнымі ва узаемаадносінах. Але трэба вельмі востра адчуваць тую мяжу, пераступіушы якую у сваім імкненні быць «сучасным», юнак ці дзяучына становяцца смешнымі у вачах іншых і нават уваходзяць з імі у канфліктную сітуацыю.

Апранацца па апошняй модзе не заусёды азначае апранацца элегантна, бо элегантная сукенка павінна быць не толькі сучасна пакроена, акуратна, з густам пашыта з прыгожай тканіны, але і адпавядаць фігуры, узросту. Кожны павінен ведаць — дзе, што і калі апранаць. Скажам, паяуленне у яркі летні дзень на вуліцы ў строгім чорным касцюме (калі гэта не звязана з асаблівымі абставінамі) раўнацэнна паяуленню ў паркалёвай сукенцы на спектаклі або арганным канцэрце.

Так, адзенне — любімае дзіця моды. Але шкада, калі некаторыя маладыя людзі ў вынiку недастатковай выхаванасці густу пераймаюць найбольш вульгарныя, крайнія і прымітыуныя яе праяуленні. Так і хочацца ім сказаць, што мода — гэта далёка не даужыня валасоу і не шырыня штаноу, не ажыатаж вакол грампласцінкі і кінаартыста. Мода — гэта не толькі культура ужывання, але і культура творчага фарміравання свайго знешняга і унутранага зместу.

Вашы паводзіны і ваш настрой — вартай увагі моладзі здаецца мне і гэтая узаемасувязь. Выхаваны чалавек ніколі не дазволіць сабе пераносіць свой дурны настрой на блізкіх, знаёмых і незнаёмых. Паспрабуйце не паказваць сябрам, знаёмым, што вы «не ў гуморы», пастауцеся да сваёй хандры з пачуццём гумару. Зусім не абавязкова дабівацца, каб вам абавязкова спачувалі, охалі, ахалі, пляскалі рукамі і г. д.

Не варта таксама настройвацца на «сур'ёзную хвалю» і спрабаваць вырашыць «сусветныя праблемы» там, дзе пануюць вяселле, жарты. Інакш вы будзеце смешным, ператворыцеся у аб'ект насмешак.

Выхаваны чалавек таксама ніколі не стане выхваляцца сваімі поспехамі, не будзе імкнуцца здавацца тым, кім ён не з'яуляецца на самай справе. Ён пастараецца быць перш за усё самім сабой, чалавекам шчырым і сумленным, з высока развітым пачуццём адказнасці за свае учынкі.

П. САВАСЦЁНАК,
аспірант кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму БДУ імя У. І. Леніна.

(Перадрукавана з «Чырвонай змены» за 14 кастрычніка 1975 г.).

ШЭСЦЬ ОРДЭНАЎ НА ТВАІМ КАМСАМОЛЬСКІМ БІЛЕЦЕ

ПА ШЛЯХУ, ВЫЗНАЧАНАМУ ПАРТЫЯЙ

У ПРАМОВЕ на III з'ездзе РКСМ У. І. Ленін гаварыў: «Камуністычны саюз моладзі толькі тады апраўдае свае званне, што ён ёсць Саюз камуністычнага маладога пакалення, калі ён кожны шаг свайго навучання, выхавання, адукацыі звязвае з удзелам у агульнай барацьбе усіх працоуных супраць эксплуататараў».

Аглядаючы 50-гадовы шлях Ленінскага камсамола, партыя у прывітанні ЦК КПСС урачыстаму камсамольскаму пленуму у дзень юбілею адзначыла: «Сваёй адданасцю ідэям камунізму, справе партыі, ініцыятывай і энергіі ў будаўніцтве сацыялізму і камунізму Ленінскі камсамол заслужыў глыбокую павагу і любоў партыі, усяго савецкага народа».

Падрыхтоука да святкавання 50-годдзя ВЛКСМ выллася у дэманстрацыю адданасці Ленінскага камсамола, усёй савецкай моладзі справе партыі, гатоунасці маладога пакалення аддаць усе свае сілы і веды камуністычнаму будаўніцтву у нашай краіне.

Пройдзены камсамолам шлях адзначаны удзелам юнакоу і дзяучат розных пакаленняу ва усіх вялікіх і малых справах краіны. Камсамольцы заусёды першымі ішлі туды, дзе цяжка, заусёды стаялі побач з камуністамі на перадавых рубяжах.

Адгрымелі войны, паусталі з руін гарады, закаласаваліся палі. Перад моладдзю паўставалі новыя задачы.

Камсамол удзельнічаў у развіцці усіх форм сацыялістычнага спаборніцтва. Камітэты ВЛКСМ клапаціліся аб тым, каб спаборніцтва сярод моладзі шырылася і развівалася, каб у яго уцягваліся усё новыя і новыя слаі працоуных, каб кожны рабочы і спецыяліст меу асобнае абавязацельства, выканаць якое ён лічыу бы справай гонару, прамым абавязкам перад народам.

Краіна пазнала многія патрыятычныя пачынанні камсамольцаў, накіраваныя на павышэнне эфектыунасці грамадскай вытворчасці.

Адным з важных кірунку удзелу камсамола у развіцці народнай гаспадаркі было шэфства ВЛКСМ над буйнымі будоулямі прамысловасці. Адной з галоуных задач камсамольскага шэфства было павышэнне тэмпаў будаўніцтва. Тысячы прыкладау сведчаць аб тым, што маладыя патрыёты паказвалі узоры сапраўднага гераізму, арганізаванасці, камуністычных адносін да справы.

Ударная камсамольская... Гэта высокая, гордая назва. Гісторыя ударнага будаўніцтва ведае нямала гераічных здзяйсненняу юнацтва.

Брэсцкая ГЭС стала сімвалам гераізму маладога пакалення, мужнасці савецкай моладзі.

Камсамол унёс уклад у будаўніцтва электрыфікаванай чыгункі Абакан-Тайшэт, якая XIII з'ездам ВЛКСМ была аб'яулена Усесаюзнай ударнай.

Гісторыя захавала подзвіг камсамола на будаўніцтве Крыварожскага Паўднёвага горна-абагачальнага камбіната. У два разы хутчэй, чым планавалася, быу узведзены гэты гігант індустрыі.

Камсамольскае шэфства мела вялікае выхаваучае, палітычнае значэнне у дзеинасці камсамола, усёи савецкай моладзі у барацьбе за выхаванне новага чалавека.

У ідэалагічнай рабоце камсамол заусёды кіравауся марксісцка-ленінскай тэорыяй, рашэннямі і указаннямі партыі. Камсамол пастаянна удасканальваu адзіную і цэласную сістэму ідэйнага выхавання моладзі. Камсамольскія арганізацыі імкнуліся даходзіць да кожнага маладога чалавека, усімі ідэйна-выхаваучымі сродкамі уздзейнічаць на яго унутраны мір, фарміравалі духоуны воблік юнакоу і дзяучат, развівалі іх актыунасць у барацьбе за камуністычныя ідэалы.

Выхаванне у працы — адна з галоуных задач камсамола. Камсамольскія арганізацыі актыуна прыцягвалі юнакоу і дзяучат да грамадска карыснай працы, дапамагалі ім набыць прафесію, павысіць кваліфікацыю і майстэрства.

Высокаідэйным, загартаваным у баях і працы сустракау сваё 50-годдзе камсамол-баец, камсамол-працаунік. Мільёны савецкіх людзей былі камсамольцамі, у яго радах змагаліся за здзяйсненне планаu партыі, прайшлі вялікую школу камунізму. За працу і подзвігі усіх камсамольскіх пакаленняу і у сувязі з 50-годдзем Ленінскі камсамол быу удастоены высокай урадавай узнагароды. «За выдатныя заслугі і вялікі уклад камсамольцаu, савецкай моладзі у станауленне і умацаванне Савецкай улады, мужнасць і гераізм, праяуленыя у барацьбе з ворагамі нашай Радзімы, актыуны удзел у сацыялістычным будаўніцтве, за плённую працу па выхаванню падрастаючых пакаленняу у духу адданасці запаветам У. І. Леніна і ў сувязі з 50-годдзем ВЛКСМ узнагародзіць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі», — гаворыцца ва Указе Прэзідыума Вярхоунага Савета СССР.

ІДЗЕМ ДА З'ЕЗДА

ПРАЦОЎНЫ РАПАРТ

У гэтыя напружаныя дні напярэдадні XXV з'езда КПСС калектыу бібліятэкі БДУ усебакова аналізуе сваю дзейнасць, распрацоувае навукова-абгрунтаваны план на дзесятую пяцігодку. Паспяховую работу бібліятэкі вызначаюць добра падабраныя і правільна арганізаваныя фонды, пастаянная і дзейсная сувязь з кафедрамі універсітэта, дыферэнцыраванае абслугоуванне чытачоу, інфармацыя аб апошніх дасягненнях навукі і тэхнікі.

Штогод наша бібліятэка абслугоувае звыш дваццаці тысяч чытачоу, якім выдаецца каля мільёна кніг, часопісаu і іншых крыніц інфармацыі. Фонд бібліятэкі у цяперашні час складае 1 млн. 275 тысяч экземпляраu. Камплектаванне фондаu праводзіцца на аснове тэматычнага плана з прыцягненнем прафесараў і выкладчыкаu кафедраu. Асобае месца у гэтай рабоце займае пастаянны аналіз забяспечанасці студэнтаu падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі.

Калектыу бібліятэкі знаходзіцца у пастаянным пошуку новых форм і метадаu работы. Арганізаваны навуковы і вучэбны абанементы, галіновыя чытальныя залы грамадскіх навук, кабінет сацыяльна - эканамічных навук. Уведзена новая форма безінвентарнага уліку вучэбнай літаратуры, што дало магчымасць хутчэй забяспечыць ею студэнтаu. Створана зала даведачна-бібліяграфічнага абслугоуання. Усё гэта дазволіць чытачам атрымаць кваліфікаваную дапамогу па любой тэме.

У мінулым годзе мы арганізавалі групавое абслугоуванне студэнтаu - першакурснікаu неабходнымі падручнікамі. Гэта дазволіла абслугоуваць іх за 7—8 дзён, а не за 20—25, як раней.

Асобую групу чытачоу бібліятэкі складаюць студэнты завочнай і вячэрняй форм навучання. Улічваючы, што гэтыя студэнты могуць займацца толькі вечарам, мы устанавілі спецыяльныя гадзіны для іх абслугоування, а у суботу наогул абслугоуваюцца толькі завочнікі. Іншагароднім завочнікам мы высылаем літаратуру у перыяд сесіі. За год высылаецца каля тысячы кніг.

Вялікую дапамогу студэнтам і выкладчыкам аказвае МБА. Гэта служба цяпер выдзелена у асобны сектар, раней яна існавала на грамадскіх пачатках. Бібліятэка у цесным кантакце з партыйнай і камсамольскай арганізацыямі здзяйсняе ідэйна-выхаваучую работу сярод студэнтаu. Для прапаганды літаратуры мы выкарыстоуваем розныя формы: выстаукі, бібліяграфічныя агляды, сустрэчы з ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаu, дыспуты, канферэнцыі. Нядауна мы атрымалі вялікі пакой, у якім арганізавалі залу новых паступленняu. Наша інфармацыйная служба працуе у цесным кантакце з АНТІ.

У 1974 годзе заняткі па асновах бібліятэчна - бібліяграфічных ведаu былі уключаны у вучэбныя планы курса «Уводзіны у спецыяльнасць». Курс па бібліятэчнай справе мае, у асноуным, практычнае значэнне, таму заняткі неабходна праводзіць групамі, знаёмячы студэнтаu з розынымі крыніцамі інфармацыі і методыкай пошуку яе у бібліятэцы.

Бібліятэка мае магчымасці складаць бібліяграфію да навуковых тэм, але пакуль што мы не атрымалі ніводнага заказу ад кафедраu. Важнай умовай павышэння якасці і удасканальвання форм і метадаu абслугоування чытачоу з'яуляецца усебаковая дапамога бібліятэчным работнікам. Таму у верасні мінулага года мы арганізавалі метадычны аддзел. Цяпер на бібліятэку універсітэта ускладзена метадычнае кіраўніцтва бібліятэкамі ВНУ і тэхнікумаu рэспублікі. Бібліятэка ужо правяла некалькі семінараu і навукова-практычную канферэнцыю па паляпшэнню арганізацыі абслугоування.

Наша бібліятэка удзельнічае ва усесаюзным даследаванні перспектыу фарміравання фондаu. Гэта вывучэнне дазволіць нам лепш арганізаваць захоуванне фондаu, распрацаваць асновы дэпазітарнага захоування.

Шматгранную, складаную работу бібліятэкі добрасумленна здзяйсняе калектыу яе супрацоунікаu. З кожным годам усё больш узрастаюць патрабаванні да бібліятэк, і калектыу шукае і знаходзіць новыя формы і метады работы, накіраваныя на далейшае паляпшэнне абслугоування студэнтаu і выкладчыкаu універсітэта, забеспячэнне іх вучэбнай і навуковай літаратурай.

І. АРЭХОЎСКАЯ,
дырэктар бібліятэкі БДУ.

ТАК ТРЫМАЦЬ ДАЛЕЙ

Вось ужо і восень спыняе свой разгон. А здаецца, зусім нядауна з рукзакамі і песнямі адпраулялiся мы з плошчы імя Леніна на бульбу.

Калі прыехалі у саугас імя Тэльмана, аказалася, што вялікі атрад прыйдзецца падзяліць на тры. Тут жа, каля машын, выбіралі камандзірау. Вось так Вася Вераб'ёу стау узначальваць атрад

Калі зараз хто пытае, ці не разгубіуся ён тады, хлопец усміхаецца: «Вядома, адказнасць была вялікая. Але я спадзяваuся на дапамогу сяброу. Ды і лічыу, што камандзір павінен разам з усімі вырашаць пытанні, а потым ужо аддаваць загад. Толькі нашы рабяты і без загадаu добра працавалі».

Потым, на камсамольскім сходзе, у сваёй справаздачы Вераб'ёу сказаu: «Цяжка вылучыць каго-небудзь, хто б працаваu лепш за астатніх. Усе стараліся». А камсорг Галя Жукоуская дадала: «Праца у нас была арганізавана добра».

Умовы стваралі самі. Колькі разоу «абівалі парогі» дырэктара саугаса, пакуль не дабіліся таго, каб своечасова забяспечвалі працай, машынамі. І з харчаваннем было шмат клопатаu.

За добрую працу атрад быу узнагароджаны граматай праулення саугаса. Немалая заслуга у гэтым атраднага камандзіра Васіля Вераб'ёва. Ужо цяпер можна лічыць, што ён выдатна справіуся са сваімі абавязкамі. Аб гэтым гавораць рабяты, якія працавалі у першым атрадзе: «Лепшага камандзіра не знойдзеш».

Немалое поле дзейнасці у Вераб'ёва на факультэце. Васіль — добры валейбаліст, з'яуляецца членам спортбюро. Ахвотна займаецца у мастацкай самадзейнасці факультэта.

У гэтым годзе Васіля абралі старастай гуртка стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. А гэта значыць, што прыбавілася яшчэ больш клопатаu. Трэба падрыхтавацца да паседжання, распытаць, як ідуць справы у членаu гуртка, выпусціць бюлетэнь.

Грамадская праца не замінае Васілю у вучобе: у яго залікоуцы — толькі «выдатна»!

Хочацца пажадаць Васілю Вераб'ёву сяброускае «так трымаць далей!»

С. РУДАБЕЛЕЦ,
студэнтка II курса журфака.
Фота **В. Драчова.**

Скончылася працоўнае лета, ва успамінах засталіся сельгасработы. Студэнцкае жыццё ўвайшло у сваю звычайную каляіну.

Паспяхова ідуць заняткі на фізічным факультэце.

НА ЗДЫМКУ: студэнты IV курса 6-й групы фізфака Ю. Шульга, А. Шарэнда, У. Раманоўскі на спецпрактыкуме па ядзернай фізіцы.

Фота Т. Петрашкевіч.

ПРАЦАЙ ПРАВЕРЫЦЬ СЯБЕ

Да 100-годдзя з дня нараджэння А. В. ЛУНАЧАРСКАГА, савецкага і партыйнага дзеяча, літаратара.

«Камсамолец вучыцца не толькі з кнігі, вучыцца не толькі на школьнай парце, а правярае усю гэтую вучобу на практыцы. Ён — грамадскі дзеяч. Ленін гаворыць, што не трэба перанапружваць сілы камсамольца, ставячы яго на «генеральскія» пасты. Не гэта важна: няхай задача будзе самая маленькая, самая просценькая. Важна, каб гэта была практычная задача, уваходзячая, як звяно, у весь наш грамадскі працоуны працэс. Мы хочам, каб камсамолец вельмі рана пачаu сваю грамадскую дзейнасць, веды свае асвятляу гэтай практыкай, практыцы дапамагаu сваімі ведамі, каб адно і другое спляталіся пастаянна, мы хочам, каб тое, што называецца акадэмічнай вучобай і грамадскай дзейнасцю, прадстауляла б неразрыуныя бакі аднаго цэласнага працэсу, яго росту, разумовага і грамадскага». Такія парады даваu Анатоль Васільевіч Луначарскі сваім малодшым сябрам.

ПАРАЖЭННЕ І ТРЫУМФ «ЛЕБЯДЗІНАГА ВОЗЕРА»

Сёння цяжка ўявіць сабе, што «Лебядзінае возера» П. І. Чайкоускага пры першым сваім паяўленні 20 лютага 1877 года на сцэне Маскоускага Вялікага тэатра не мела поспеху.

У тыя гады на балетнай сцэне гаспадарыу тып манументальна - параднага ці забаўляючага спектакля. Пазбаўлены адзінства драматургічнай задумы, балет распадаўся на асобныя нумарыдывертысменты, галоўнае значэнне надавалася раскошным касцюмам, сцэнічным эфектам і віртуозным сольным варыянтам танцоушчыц. Стварэнню такога тыпу спектакля садзейнічала часам бліскучая, але ў цэлым ілюстратыўная і павярхоўная музыка Пуні і Мінкуса, на яе абапіралася эклектычная харэаграфія французскага балетмайстра Сен-Леона.

Верны паслядоунік Сен-Леона балетмайстар Ю. Рэйзінгер, звярнуушыся да першага балета Чайкоускага, не адгадаў рэформы, якую несла «Лебядзінае возера» — балет кампазітара-сімфаніста. Ён паставіў спектакль па старых, звыклых канонах.

«Лебядзінае возера» адрадзілася на пецярбургскай сцэне ў 1895 годзе у пастаноуцы харэографаў Марыуса Пеціпа і Льва Іванова. Яны упершыню адчулі наватарства балетнай музыкі Чайкоускага, яе магчымасць і права—нароуні з сімфанічнай — раскрываць унутраную плынь дзеяння, увасабляць характары герояу балета у іх узаемадзеянні, развіцці і барацьбе. Пастаноука пацвярджала новую форму балетнага тэатра — сімфанічны балет, які заключаў у сабе многія рэалістычныя рысы. Высокагуманная тэма перамогі кахання над смерцю узнікла у арганічным зліцці музыкі Чайкоускага і харэаграфіі. «Лебядзіны» акт Л. Іванова стаў урачыстасцю сімфанічнага танца: танцавальны малюнак, позы і рухі салістау у спалучэнні з танцам кардабалета выяўлялі поліфанічныя асаблівасці музыкі, раскрывалі яе эмацыянальна-псіхалагічны змест. Здзіуленым сучаснікам ва усім сваім бляску з'явілся сэнс і значэнне рэформы, зробленай Чайкоускім у гэтым балеце, які з таго часу вось ужо 80 год робіць сваё трыумфальнае шэсце па сцэнах усяго свету.

СТВАРАЎ «ПАРТРЭТ» РАДЗІМЫ...

Яго называюць па-рознаму: «сын Расіі», «майстар савецкага мастацтва»... З дотаздымкаў на нас глядзіць спакойны чалавек з акуратнай густой барадой, мяккімі ўважлівымі вачыма. Канстанцін Фёдаравіч Юон, чыё 100-годдзе з дня нараджэння мы адзначаем, быў сапраўдным мастаком. Сэрца яго заусёды належала свабыццам нешта, а асноунага так і не закранулі. Усё справы, справы. У кіно запрасіць яе ці што, калі здасць трэці экзамен?

Акцябрына спадабалася мне сваёй яршыстасцю. Я жадаў ёй найлепшых адзнак. Калі пашчасціць, будзем разам вучыцца у адной навучальнай установе...

В. ЗАДАЛЯ

А. АКЦЯБРЫНА

АПАВЯДАННЕ

(Заканчэнне. Пачатак у № 31 за 6 лістапада).

Акцябрыну я убачыу зусім нечакана. Яна стаяла на прыступках галоунага корпуса з некалькімі сяброукамі.

Я сцішыу крок, ці пазнае? Пазнала.

— Добры дзень, Віця!

— Дзень добры. Як справы?

— Нічога... у сэнсе дрэннага. Нармальна. Толькі што здала другі экзамен. Можаш павіншаваць, на гэты раз пяцёрка.

— Віншую. Значыць, маеш сур'ёзны намер стаць студэнткай?

— Гэта яшчэ як сказаць, два экзамены наперадзе. А ты як маешся?

— Што я? Жыву, як бачыш, здаю экзамены, спадзяюся...

— Шчасліва табе. Пагаворым у другі раз. А зараз мы ідзём у бібліятэку,— Акцябрына кіынула у бок дзяучат, якія нецярпліва чакалі яе, і, нібы просячы прабачэння, сказала: — Праз некалькі дзён самы галоуны і цяжкі экзамен, трэба рыхтавацца, прабач...

Вось і зноу гаварылі

Каля гістфака было многа людзей. Мамы і таты хвалявaліся за сваіх чадаў. Гэта ж не жарты— здаваць уступныя экзамены.

Акцябрыну я зауважыу здалёк. Але яе тут жа праглынуў натоуп. Крыху пазней я сустрэу яе. У вачах дзяучыны былі сум і занепакоенасць. Я праглынуу прапанову пайсці у кіно. Няцяжка было зразумець, што Акцябрына ці атрымала не тое, што хацела, ці зусім... Пра апошняе не хацелася думаць.

Мы моучкі пакрочылі па універсітэцкім двары.

— Вось так, Віця,— уздыхнула дзяучына.

— Што здарылася? — я спыніуся, зазірнуу дзяучыне ў вочы. Яна схіліла галаву.

— Тройка па экзамену...

Хацелася супакоіць яе, нагаварыць цёплых слоу. Але навошта, каму патрэбны гэты наіуны падман? Я машынальна узяу Акцябрыну за руку.

Мы выйшлі з універсітэцкага гарадка і зліліся з людской плынню. Твар дзяучыны быў сур'ёзны і строгі. Я упершыню бачыу яе такой. Мне быу зразумелы настрой Акцябрыны: сам двойчы перажыў тое ж.

Каля інтэрната, дзе жыла дзяучына, мы спыніліся, моучкі пастаялі, не ведаючы, аб чым гаварыць.

— Я пайду, галава разбалелася,— Акцябрына выслабаніла руку, сумна усміхнулася.— Ты не бойся за мяне, пад аутобус не кінуся, а калі не паступлю, то паспрабую на будучы год. Поспеху табе, Віця, і дзякуй за усё.

Яна гаварыла так, нібы развітвалася назаусёды.

— Ты што задумала? У цябе ж яшчэ адзін экзамен!

— Я помню аб гэтым.

Дзяучына пастаяла яшчэ з хвіліну, раз-пораз пазіраючы на мяне, потым марудным крокам накіравалася да дзвярэй інтэрната, азірнулася і знікла ў будынку.

Больш я не сустракаў яе, хаця неаднаразова шукаў з ёю сустрэчы. Мабыць, дзяучына у тую ж ноч паехала дахаты. Шкада, што у мяне не было яе адраса. І чаму не здагадауся узяць яго?

Кожны раз, калі даводзіцца бываць на аўтавакзале, асабліва напярэдадні уступных экзаменаў, я з надзеяй шукаю знаёмую дзявочую постаць, мару аб сустрэчы, якая, хацелася б верыць, рана ці позна адбудзецца.

Скончыу свае гастролі у Мінску Ленінградскі вакальна - інструментальны ансамбль «Пяючыя гітары» пад кіраўніцтвам А. Васільева.

Ансамбль створаны у 1966 годзе і за няпоунае дзесяцігоддзе сваёй творчай біяграфіі дау у нашай краіне і за мяжой звыш 3 тысяч канцэртау. Сёння гэты высокапрафесійны калектыу уступае у новы этап сваёй дзейнасці. Захоуваючы у канцэртнай практыцы песенныя праграмы, ансамбль «Пяючыя гітары» стварыу своеасаблівы наватарскі эстрадна-оперны спектакль «Арфей і Эурыдыка» у пастаноуцы Марка Разоўскага. Цёпла прынялі мінскія гледачы спектакль, які спалучае у сабе відавочнасць музычнага тэатра з элементамі канцэртнасці. Зонг-опера А. Журбіна і Ю. Дзімітрына «Арфей і Эурыдыка» напісана у жанры лірычнай трагедыі.

НА ЗДЫМКАХ: сцэна з зонг-оперы «Арфей і Эурыдыка». Арфей — Альберт Асадулін; Эурыдыка — Ірына Панароуская.

Фота
Т. Петрашкевіч.

ЛІСТОК ДАІ

АГЛЯД ДЫСЦЫПЛІНЫ І ПАРАДКУ НА ДАРОГАХ

Восень — пара актыунага руху на дарогах. Кліматычныя змены не аказалі уплыву на інтэнсіунасць. Восень — час прыстасавання да умоу руху, патрабаванняу бяспекі шматлікай «маладзёжнай» часткі насельніцтва: малодшых школьнікау, навучэнцау ПТВ, студэнтаупершакурснікау. Ускладняюць працэс захавання бяспекі руху больш каротkі светавы дзень, частыя асадкі, туман.

Усё гэта патрабуе паляпшэння дысцыплiны руху на дарогах. З мэтай прыцягнення увагі арганізацый, ведамстваў, усіх вадзіцеляу і пешаходау да праблем прадухілення аварыйнасці у СССР у кастрычніку 1975 года праводзіуся Усесаюзны агляд бяспекі дарожнага руху. Гэта, па сутнасці, праверка практычнага укладу кожнай арганізацыі, кожнага вадзіцеля і пешахода у складаную работу па барацьбе з аварыйнасцю.

У сістэме і планах прафілактыкі дарожнай аварыйнасці у кожнай арганізацыі асабліве месца трэба адвесці лекцыям і гутаркам па бяспецы руху, якія павінны правесці у калектывах грамадскія прапагандысты ДАІ. Трэба растлумачыць асобныя патрабаванні правіл бяспекі руху. Вельмі карысныя і прыносяць вялікі выхаваўчы эфект сустрэчы з калектывамі працоуных у форме вечароу пытанняу і адказау, кансультацыи, дыспутау моладзі. Заслугоувае адабрэння практыка публічнага агляду у калектывах паведамленняу з ДАІ аб парушэннях правіл дарожнага руху.

Цяпер стан прафілактыкі дарожна - транспартных здарэнняу ацэньваецца не толькі па узроуню і якасці работы транспартных падраздзяленняу, але і з абавязковым уликам паводзін пешаходаў.

Асабліва строга трэба спытаць з вадзіцеляу і пешаходау, якія удзельнічаюць у руху, знаходзячыся у стане ап'янення. П'яніц з дарогі вон! — толькі так стаіць пытанне. З п'янымі вадзіцелямі, як вядома, размова каротkая: па закону яны будуць пазбаулены праvоу на кіраванне транспартам на доугі тэрмін і аштрафаваны; у адносінах да уладальнікау аутамашын і матацыклау, якія сістэматычна п'янствуюць, перад народным судом будзе пастаулена пытанне аб канфіскацыі у іх транспартных сродкаў.

Нарэшце, праблема бяспекі руху маленькіх пешаходау. Дарожна - транспартныя здарэнні з дзецьмі складаюць каля 1/5 іх агульнай колькасці. Калецтва ці гібель дзіцяці — вялікае гора для сям'і. Яно тым большае, калі дзіця пацярпела ад недагляду дарослых, ад нявыхаванасці у пытаннях бяспекі руху.

В. А. АНАНЬІН,
супрацоунік ДАІ.

ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

У магазіне, што размешчаны каля вучэбных карпусоў у Шчамыслицы, у продаж паступіла незвычайная тканіна, якая ужо заваявала папулярнасць у студэнтаў. Тканіна расшыта матэматычнымі, хімічнымі і іншымі формуламі. Кожная дзяучына можа падабраць сабе матэрыял па густу і у адпаведнасці з вучэбнымі дысцыплінамі. Студэнтам дазваляюць прыходзіць у гэтым убранні на лекцыі. Аднак на экзамены у такім выглядзе не пускаюць.

***

На дошцы аб'яу у галоуным корпусе універсітэта вісела паперка: «Рыхтую да паступлення у інстытут Склі фасоускага».

***

З размовы двух студэнтаў:

— Ты на лекцыю пойдзеш?

— Абавязкова: у мяне ёсць цікавая кніга.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Рэдактар
Аб'ём—1,5 друк. ар. АТ 05551 Заказ № 1660. А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.